УДК 882.6

**В.В. Лапацінская**

# Паэзія Анатоля Сербантовіча: да праблемы індывідуальнага стылю

Літаратурны працэс другой паловы 50-60-х гадоў XX стагоддзя своеасаблівы, неаднародны і разнастайны у ідэйна-эстэтычным плане, што было абумоўлена зменамі ў грамадска-сацыяльным жыцці і – адпаведна – у настроі, светаразуменні і светаадчуванні мастакоў слова. З прычыны пацяплення палітычнага клімату і паслаблення цэнзуры адбываецца павольнае ажыўленне грамадскага і культурнага жыцця. У людской свядомасці ўзрастае роля індывідуальнага, асабістага, суб'ектыўнага фактару, цікавасць да жыцця «прыватнай асобы». Невыпадкова вядомы літаратуразнавец і крытык Мікола Арочка назваў гэты перыяд «парою маральнага самаачышчэння». Узвышэнне чалавека па ўсіх пазіцыях становіцца тэндэнцыяй часу. «Паэтаў захапіла ўжо сама магчымасць грамадска-актыўнага служэння, сцвярджэння чалавечага права на ўласнае выказванне, свой погляд, думку, сваё права на ўдзел у вырашэнні набалелых праблем часу. Захапіла пропаведзь вяртання чалавеку яго элементарных, адабраных культаўскім дыктатам дэмакратычных правоў і свабод», – чытаем у артыкуле згаданага аўтара [1].

Выкрыццё культу асобы Сталіна, упершыню абнародаваная лічба ахвяраў вайны, рэабілітацыя часткі рэпрэсаваных людзей на XX з'ездзе партыі – усё гэта ашаламіла звычайнага чалавека і з'явілася прычынай духоўнага зруху ў яго свядомасці. Светапогляд людзей змяніўся ў галоўным і асноўным – яны пачалі пераацэньваць увесь комплекс жыццёвых і маральных каштоўнасцяў, што былі выпрацаваныя ў гады сталіншчыны. Зразумела, мастакі слова адразу адчулі «пераходнасць» часу і маштабнасць надыходзячых перамен. Таму лірыка паэтаў філалагічнага пакалення адразу зарыентавалася на маштабны паказ рэчаіснасці, яе глыбокую і ўсебаковую ацэнку, на асэнсаванне праблемы Чалавек і Сусвет, выяўленне яго месца і ролі не толькі на Зямлі, але і ў Космасе. У пацверджанне сказанага хочацца прывесці выказванне вядомага крытыка рускай літаратуры Адольфа Урбана: «Узвышэнне чалавека – не эпізод літаратурнага жыцця, не індывідуальная прыхільнасць некалькіх мастакоў, а агульны клопат, выкліканы глыбокай увагай да людзей, думкай аб іх будучыні, аб лёсах краіны і Сусвету» [2].

Ідэйнай асновай творчасці ў 60-я гады XX стагоддзя стала філасофская канцэпцыя Чалавека, пачатак якой быў у многім пакладзены кнігамі, падобнымі на аднаіменны зборнік вершаў літоўскага паэта Э. Межэлайціса. Ідэйна-

эстэтычная вартасць твораў пра Чалавека вызначалася «пераводам» у маральна-этычны, філасофскі план размовы пра духоўны свет чалавека, яго ўзаемаадносіны з гісторыяй, сучаснасцю і будучыняй. Падобная пастаноўка праблемы патрабавала ад мастака гуманізацыі творчасці ў цэлым, імкнення вылучыць у характарах тыя рысы, што «працуюць» на перабудову светапогляду асобы ў святле, як тады здавалася, вечных камуністычных ідэалаў. Гэта быў час «трыумфу чалавечнасці і гуманізму» [3]. Невыпадкова ў 60-я гады праблеме новага чалавека і станаўлення гарманічнай асобы прысвячаліся дыскусіі, выйшлі калектыўныя зборнікі і манаграфіі даследчыкаў [4].

Зменлівая, рухомая, дынамічная новая эпоха паставіла паэтаў і пісьменнікаў перад неабходнасцю шукаць і знаходзіць нестандартныя рашэнні набалелых пытанняў, паказваць сучаснасць у кантэксце мінулага і будучыні. «Абавязак літаратуры мысліць глабальна, не выпускаючы з поля зроку цэнтральнай сваёй цікавасці, якую я разумею як даследаванне асобнай чалавечай індывідуальнасці, – пісаў Ч. Айтматаў, – а ўсё гэта патрабуе ад пісьменніка пашырэння філасофскага дыяпазону, узбуйнення светапогляду, дэталізацыі псіхалагічнай выявы нашага сучасніка» [5]. Падобныя рысы, пра якія піша славуты майстар, былі характэрныя перш за ўсё для лірычнай паэзіі, якая звычайна вельмі хутка рэагуе на запатрабаванні часу і прадбачыць развіццё чалавецтва ў пэўным напрамку, на шляху прагрэсу ці рэгрэсу, дэградацыі.

У 1960-м годзе рускі паэт Яўген Вінакураў выпусціў зборнік лірыкі з характэрнай назвай – «Твар чалавечы» і ў адным з праграмных вершаў выказаў сваё разуменне задач літаратуры пераломнага перыяду жыцця: «Страшимся мы, как видно, неспроста / Быть, как искринки, схожи меж собою». Праз год быў напісаны другі верш – «Разнообразие» пра сэнс жыцця, прызначэнне чалавека на зямлі: «Разнообразье – принцип, / Лежащий в основе жизни». «Мы» складаемся з «я» – вось пафас яго ж верша з лаканічным загалоўкам «Я». Вось так адмаўлялася сапраўдная паэзія ад стэрэатыпу, абвешчанага яшчэ Уладзімірам Маякоўскім: «Еденица – вздор, еденица – ноль», і шукала шляхоў паяднання адзінкавага і агульнага, «Я» і «Мы».

Яшчэ адной тэндэнцыяй літаратурнага працэсу перыяду «адлігі» стаў рамантычны пафас. Амаль кожны таленавіты майстар, абсалютная большасць твораў канца 50-60-х гадоў знаходзіліся ў рэчышчы рамантычных традыцый літаратуры як XIX, так і першай трэці XX стагоддзяў. Карыстаючыся паняццем «рамантызм XX стагоддзя», мы зыходзім, перш за ўсё з гегелеўскага разумення «рамантычнага» як выніку «суб'ектывізацыі» светапогляду, паводле якога і адбываецца «сашгурхоўванне», сутыкненне рэальнасці і аўтарскага ідэалу. Трэба дадаць да гегелеўскай формулы, што рамантызм XX стагоддзя сваім прынцыпам «двухсветавасці» вельмі падобны да рамантызму XIX стагоддзя, але драматычным адчуваннем дваістасці свету, што звязана з катаклізмамі мінулага стагоддзя (рэвалюцыі, войны, таталітарызм, абясцэньванне чалавечага жыцця), і невядомымі XIX стагоддзю сродкамі істотна адрозніваецца ад яго. Такія спецыфічныя рысы рамантычнага стылю, абумоўленыя грамадскімі зменамі, барацьбой новага (ачышчальнага, гуманнага) са старым (таталітарным) выявіліся ў літаратуры 60-х гадоў XX стагоддзя. Вядомая даследчыца беларускага рамантызму Т.К. Чабан на гэты конт адзначыла: «Іменна ў гэты перыяд літаратура канчаткова вызвалілася з путаў схематызму, лакіровачнасці, у ёй узраслі грамадзянскасць, шчырасць, давер да жыцця, да чалавека. Была адкінута вузкадагматычная канцэпцыя сацыялістычнага рэалізму як метаду «закрытага», абмежаванага строгімі стылявымі рамкамі. Пашырыліся літаратурныя гарызонты, узрасла творчая свабода пісьменнікаў, і гэта абумовіла наватарскія пошукі новых мастацкіх форм, смелае выкарыстанне нязвычных дагэтуль тыпаў вобразнасці, жанраў, стыляў, паэтыкі. < ... > Наглядаецца актыўны зварот да ўмоўных форм

адлюстравання жыцця, узмацненне асабістага пачатку, аўтабіяграфізму, пашырэнне магчымасцей аўтарскага «я». Усё гэта адкрывае прастор для рамантычнага светаадчування, вобразнасці» [6].

Яшчэ адной адметнасцю літаратуры 60-х гадоў становіцца з'яўленне «эстраднай» паэзіі, прадстаўніком якой стала паэтычная моладзь таго часу, акрыленая надзеяй і верай у лепшае, чалавечнае. У вершах маладых аўтараў адлюстроўваліся самыя злабадзённыя пытанні, адным з якіх было пытанне пра ўзаемаадносіны чалавека і грамадства, абвяргалася паняцце чалавека-«вінціка». «Кто мы – фишки или великие?» – задаваўся пытаннем А. Вазнясенскі, а Я. Еўтушэнка кідаў у людскі натоўп лаканічнае: «Будем великими!». Р. Раждзественскі ва ўнісон равеснікам прызнаваўся: «Не верю в винтичный разум!» Наш беларускі паэт А. Сербантовіч у вершы «Быць дарослаю хоча Танька» просіць дзяўчынку быць не толькі дарослаю, а вялікаю. Так эстрадная паэзія сцвярджала вялікаснасць свабоднай, незалежнай асобы ў грамадстве.

Анатоль Сербантовіч быў выразнікам у паэтычным слове ідэй эпохі «адлігі». Нарадзіўся ён 13 мая 1941 года ў вёсцы Ордаць Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Як і ўсе яго равеснікі, быў дзіцем вайны, якая наклала свой адбітак не толькі на здароўе, але і на жыццёвыя прынцыпы і светаадчуванне будучага паэта. «Паступова ў свядомасці ... складваўся вобраз жыцця як вялізнага міннага поля, гатовага кожнае імгненне выбухнуць, асляпіць, пашкуматаць тваё цела» [7].

Пасля заканчэння школы Анатоль Сербантовіч два гады працаваў грузчыкам у мясцовым калгасе, пасля ў 1960-м годзе паступіў на журналісцкае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ. Па яго заканчэнні супрацоўнічаў у часопісе «Бярозка», газеце «Піянер Беларусі».

Першыя вершы, заметкі і фельетоны пачынаючага аўтара былі надрукаваны ў раённай газеце «Чырвоны барацьбіт» яшчэ ў 1959 годзе.

Спадчыну А. Сербантовіча складаюць чатыры зборнікі лірыкі. «Азбука» (1966), «Міннае поле» (1968), якія выйшлі яшчэ пры жыцці паэта, і «Пярсцёнак» (1971), «Жаваранак у зеніце» (1989), што ўбачылі свет ужо толькі пасля яго смерці. Творы, сабраныя ў іх, яднаюць высокі грамадзянскі пафас, уважлівасць да маральна-этычнай, філасофскай, а не палітычнай праблематыкі, адметная вобразнасць.

Першы зборнік паэта «Азбука» адразу выклікаў зацікаўленасць літаратурнай крытыкі. Асабліва цікавай была «Песня гартуецца ў паходзе» В. Макарэвіча, у якой даецца станоўчая характарыстыка вершаў: «Гэта, можна сказаць, была хай сабе і нягучная, але ўсё-такі адказная заяўка на крэда» [8]. Найбольш значнымі атрымаліся артыкулы С. Марчанкі, Р. Бярозкіна, А. Давідоўскай, у якіх даецца ўсебаковая ацэнка напісанага паэтам. Святлана Марчанка адзначыла тэмпераментнасць характару лірычнага героя паэта, падкрэсліла думку пра ўнутранае гарэнне, што нарадзіла грамадсканадзённыя вершы паэта «Нямыя размаўляюць пальцамі», «Антыюбілейнае», «Пігмеі». Сярод недахопаў, уласцівых творчасці мастака слова, названыя «недысцыплінаванасць думкі», а таксама тое, што некаторыя вершы напісаныя «дзеля вершаў» («Маналог Чарлі Чапліна», «Сюды не далятала рэха колаў»), ставіць у віну аўтару экзальтаваную сентыментальнасць. У цэлым зборнік заслужыў станоўчую адзнаку і гэтага крытыка: «... у сэнсе грамадскай, палітычнай мэтанакіраванасці некаторых сваіх вершаў А. Сербантовіч значна апярэдзіў многіх равеснікаў па паэзіі» [9].

На нашу думку, лірыка Анатоля Сербантовіча заслугоўвае ўвагі не толькі страснасцю свайго грамадскага гучання, але і непаўторнай вобразнасцю, пастаноўкай у цэнтр увагі адметнага героя – рамантыка, праўдашукальніка, вандроўніка. Характар яго героя – гэта, у першую чаргу, характар самога паэта. Сяргей Кавалёў менавіта пра гэта напіша праз дваццацігоддзе пасля першых

рэцэнзій на зборнікі паэта: «І толькі адна рыса характару [Анатоля Сербантовіча – В.Л.] перашкаджала поўнасцю адчуць сябе заспакоенным і прыстасаваным да гэтага свету – бескампраміснасць, не проста чэснасць і шчырасць душы, а хутчэй дзіцячая прастадушнасць, нежаданне рабіць нават выключэнне з агульнага кодэкса чэсці» [10]. Дададзім, што падобнага выключэння не робяць і героі многіх вершаў Анатоля Сербантовіча, бо прыстасаванства і мяшчанства – гэта не іх стыхія. Радкі верша «Пустое «ўра» нікога не парадуе» – уяўляюць сабой жыццёвае крэда як паэта, так і яго герояў:

*Тых, хто не бачыць дрэннага праз добрае,*
*У прамовы лье салодкую ваду, –*
*Лічу як нашых самых злейшых ворагаў*
*І першы ў бой бязлітасна іду.*

Герой Анатоля Сербантовіча – лермантаўскі бунтар, і адначасова пакутнік, адрынуты зямлёй і не прыняты небам. Пацверджаннем выказанага тэзісу можа быць паэма «Абвал», у якой аўтар стварае невядомы да яго беларускай літаратуры рамантычны вобраз Снежнага чалавека. Герой праходзіць праз пераўвасабленне і змены гістарычных перыядаў (пачатак стагоддзя, Вялікая Айчынная вайна, паэтаў час) і заўсёды яго чыстыя і сумленныя паводзіны прымаюцца акружаючымі яго людзьмі як вар'яцтва, таму ў выніку яму нічога не застаецца, як цешыцца адзінстай, быць вольным у першазданным натуралістычным свеце. «Культ асобы, культ адзінкі < ... > зрабіў адным з самых гапоўных матываў сваёй паэзіі Анатоль Сербантовіч. І ў гэтым заключаецца адзін з момантаў яе ідэйна-тэматычнага наватарства», – зазначае Мікола Мішчанчук [11]. Культ адзіноты вызначае паэзію Анатоля Сербантовіча і адрознівае яго погляд на адносіны чалавека з грамадствам ад ранейшай беларускай рамантычнай традыцыі (Уладзіслаў Сыракомля, Янка Купала, Якуб Колас), але такая пазіцыя, як нам думаецца, яднае творчасць А.Сербантовіча з лірыкай рускіх паэтаў XIX стагоддзя (Я. Баратынскім, М. Лермантавым) і паэзіяй шасцідзесятнікаў – Я. Вінакурава, А. Вазнясенскага і Р. Раждзественскага, а таксама з творчасцю беларускіх паэтаў-эмігрантаў А. Сапаўя, М. Сяднёва, Ул. Клішэвіча.

Памяць пра вайну, дзяцінства, што прайшло «пад гарматнымі ствaламі» неадступна крочыць за Анатолем Сербантовічам. Па гэтай прычыне і напісана так многа вершаў на гэтую тэму, што склалі ў асноўным зборнік «Міннае поле» (названы па аднаіменнай паэме). Паэма «Міннае поле» пачынаецца радкамі, якія прадвызначаюць дамінантны ідэйны пафас зборніка:

*Трывог і сноў пазбавіцца? Ніколі!*
*Я спаць кладуся, як іду у бой.*
*Каторы год паўзу па мінным полі,*
*Па мінным полі памяці сваёй.*

Паэма «Міннае поле» філасофска-рамантычная, насычаная вобразамі-сімваламі, цэнтральны з якіх – міннае поле. Нельга не адзначыць і яе цікавую кампазіцыю. Каб данесці ідэю пра бесчалавечнасць, бязлітаснасць вайны, Анатоль Сербантовіч удала карыстаецца элементамі драмы – укладвае ў вусны дыялогі з бацькамі, смерцю, жыццём, забойцам бацькі і яго нашчадкамі. Аўтар называе часткі паэмы – «выбухамі», што дае яму магчымасць не толькі стварыць сімвалічны малюнак вайны, але і «агучыць» яго. Вайна – гэта міннае поле, на якім выпрабоўваюцца на трываласць і чалавечнасць людзі. Кожны новы выбух – гэта новы лёс. Цеснае перапляценне рэальнага і ўяўнага таксама «працуе» на рэалізацыю ідэі: «падарвацца ўсюды можна / На міне, што здаўна ляжыць...». Паэт усім дзеяннем-споведдзю сцвярджае думку, што вайна і яе наступствы не толькі справа памерлых, а, у першую чаргу, жывых. «Многімі сваімі рысамі яна блізкая «Суду памяці» рускага паэта Ягора Ісаева. Там набывае страшныя абрысы і разрастаецца да злавеснага сімвала смерці вобраз стрэльбішча, дзе збірае адстраляныя кулі на адліўку Ганс, у Сербантовіча такую ж ідэйна-эстэтычную

функцыю выконвае вобраз міннага поля. І ў Сербантовіча, і ў Ісаева адбываецца ўнутраны суд сумлення, ацэнка і пераацэнка трагедыйных момантаў чалавечага жыцця», – чытаем у сучасным даследаванні [11, с. 31-32].

Матыў міннага поля-памяці паэт разгортвае, карыстаючыся рамантычнымі стылявымі сродкамі. І ў трох «ваенных» вянках санетаў. Самі іх назвы сталі вобразамі-дэталямі – «Васілёк», «Курганы», «Салдат». У вянках санетаў раскрылася яшчэ адна рыса таленту аўтара – уменне па-майстэрску карыстацца цвёрдымі вершаванымі формамі.

Жыццё паэта трагічна абарвалася на дваццаць дзевятым годзе. Так многа паэтам было зроблена, «толькі адзінокі і самотны Ангел Смерці [задума вянка вянкоў санетаў «Мужанка» – В.Л.] так і не пройдзе свой пакутлівы шлях праклляцця, так і не сустрэнецца са сваёй ракавой каханай, бо ён так і не з'явіўся на гэты свет, так і кануў у нябыт – ненароджаны, ненапісаны. Але і тое, што нарадзілася, што *гарэла і білася* ў душы Паэта дзеля людзей, – ніколі не згасне, не сыдзе ў нябыт» [10, с. 168]. Лепш чым сказана, не скажаш. Згасла зорка першай велічыні на небасхіле роднай літаратуры. І задача наша – аднавіць святло яе промняў, сагрэць яе, халодную, цяплом сваёй увагі і любові.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Арочка М.** Вяршаліна паэзіі: Агляд беларускай паэзіі 60-х гадоў // Полымя, 1995, №11. С. 234-235.
2. **Урбан А.** Узвышэнне чалавека. Нататкі пра сучасную паэзію. Л., 1968. С. 248.
3. **Мішчанчук М.** Па зямлі – на поўны рост: Лірыка паэтаў, дзяцінства якіх было апалена вайной // Настаўніцкая газета, 1979, 17 сакавіка. С. 2.
4. **Літаратура і новы чалавек.** М., 1963.
5. **Гуманізм і сучасная літаратура.** М., 1963.
6. **Шчэрбіна В.** Наш сучаснік. Канцэпцыя чалавека ў літаратуры XX стагоддзя. М., 1964.
7. **Аўчарэнка А.** Спрэчка пра чалавека. // Сацыялістычны рэалізм і сучасны літаратурны працэс. М.,1968.
8. **Межэлайціс Э.** Чалавек з вялікай літары. Известия, 1962, 1 мая.
9. **Айтматаў Ч.** Усё датычыцца ўсіх // Пытанні літаратуры, 1980, № 12. С. 6.
10. **Чабан Т.К.** Крылы рамантыкі: Рамантычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай паэзіі. Мн.,1982. С. 9-10.
11. **Мішчанчук М.** Недапетая песня. Развагі пра творчасць Анатоля Сербантовіча // Роднае слова, 1997, № 5. С. 21.



## SUMMARY

*The article is consecrate to creation of talented Byelorussian poet Anatoly Serbantovich and studying it in the context literary process the sixties of XX century. This literary artist, represents philological generation, looked for the ways of deliverance personality from shackles of totalitarian consciousness and defended eternal values of man's life. The creation of Anatoly Serbantovich is ponderable constituent of stedding writers' post-war generation and all our national literature*


*Поступила в редакцию 30.03.2003*